ISSN 0321-1649 (print)
УДК 821.161.3.09

Паступіў у рэдакцыю 05.05.2015
Received

**Г. Ю. Новік**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,
Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ФЕНОМЕН ЛІТАРАТУРЫ НОН-ФІКШН: АСПЕКТЫ ТЭОРЫІ І ВЕРЫФІКАЦЫІ

На рубеже XX–XXI веков в белорусской литературе наблюдается стремительная экспансия произведений с ярко выраженным документальным началом. Возникновение большого объема мемуарных, дневниковых, исповедальных, эпистолярных, биографических текстов детерминировано влиянием тенденций зарубежной литературы, где документалистика получила название non-fiction. Однако в отечественной гуманитарной науке изучение документальной прозы носит ограниченный и фрагментарный характер, что негативным образом влияет на восприятие литературного процесса, искажая его.

Цель исследования – теоретическое осмысление феномена non-fiction, для осуществления которого применяются сравнительный и структурно-аналитический (с элементами системного моделирования) методы. Задачи включают в себя сужение круга синонимических терминов, используемых для обозначения документальной литературы; определение дифференциальных черт феномена нон-фикшн, а также уровней его существования; выявление жанрового поля документальной прозы.

Автор приходит к выводу, что наиболее релевантными терминами для обозначения феномена нон-фикшн являются «документальная литература» и «документалистика». Для non-fiction характерно существование как в ипостаси самостоятельной «литературы факта», так и в качестве документального начала художественного произведения, причем в последнем случае тексты подразделяются на автобиографические (дневники, мемуары, исповеди, эпистолярий и т.п.) и документально-художественные (художественные хроники, эссе, беллетризированные биографии и т.п.). Жанровыми особенностями, общими для большинства произведений нон-фикшн, являются «утроение» авторского присутствия в тексте, гипотетическая неоконченность, соотнесенность текста с постмодернистской традицией, балансировка на границе реальности и вымысла.

*Ключевые слова:* документальная литература, документалистика, non-fiction, художественная литература, автобиографическая проза, документально-художественные произведения.

**A. Y. Novik**

*Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre,
National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Republic of Belarus*

## NON-FICTION PHENOMENON: THEORETICAL AND VERIFICATIONAL ASPECTS

The Belarusian literature in recent decades demonstrates rapid expansion of works with a distinct non-fictional basis. The increasing emergence of memoirs, diaries, confessions, epistolary and biographical texts is influenced by trends in foreign literature where documentary prose was termed non-fiction. However, studying documentary prose in the Belarusian humanitarian science is limited and fragmentary. This affects and distorts the perception of the literary process.

The article seeks to explore and theoretically comprehend the non-fiction phenomenon using the comparison and structural analysis methods (including system modeling elements). The objectives include limiting the list of synonymic terms that are used to denote documentary literature, determining differentiating features and existence levels of the non-fiction phenomenon and identifying the genre field of documentary literature.

The author arrives at the conclusion that the terms “documentary literature” and “documentary” are most relevant to denote the non-fiction phenomenon. It is typical for the non-fiction phenomenon to exist both as independent ‘literature of fact’ and as a documentary basis for a work of fiction. In the latter case, texts are subdivided into autobiographies (diaries, memoirs, confessions, epistolary texts etc.) and documentary fiction (fictional chronicles, essays, fictionalized biographies etc.). Common genre features of most non-fiction works are the author’s presence ‘triplication’, hypothetical incompleteness, correlation with the post-modern tradition, and balancing between reality and fiction.

*Keywords:* documentary literature, documentary, non-fiction, fiction, autobiographical prose, documentary fiction works.

Адной з яскравых прыкмет сучаснай беларускай літаратуры з’яўляецца яе жанравая разнастайнасць. Non-fiction (або нон-фікшн) у шырокім сэнсе – літаратура, створаная з абмежаваным выкарыстаннем вымыслу. Праз сваю неаднастайнасць акрэсленая з’ява дагэтуль не атрымала сярод даследчыкаў аднагалоснай трактоўкі і ўніверсальнай дэфініцыі. Як заўважае А. Местэргазі, для абазначэння аднаго і таго ж паняцця часта ў сінанімічны шэраг беспадстаўна ставяцца тэрміны “дакументальная літаратура” (дакументалістыка), “літаратура факта”, “чалавечы даку-

© Новік Г. Ю., 2017

мент”, “дакументальна-мастацкая літаратура”, “газетна-часопісная дакументалістыка”, “літаратура нон-фікшн” і інш. [1, с. 10]. У сваю чаргу даследчыца прапануе аўтарскі тэрмін “літаратура з дамінуючым дакументальным пачаткам” для дэталёвага вывучэння мастацкай прозы, якая «<…> распавядае пра рэальныя падзеі і асоб з прыцягненнем дакументальных сведчанняў. Пры гэтым імёны, назвы могуць быць сапраўднымі, а могуць <…> замяняцца на прыдуманыя; пад дакументальным сведчаннем разумеюцца як афіцыйныя дакументы, даведкі і інш., так і запісы вусных аповедаў, у тым ліку літаратурна апрацаваныя, а таксама нявыдуманыя аповеды пісьменнікаў» [1, с. 16].

Многія літаратуразнаўцы спрабуюць сфармуляваць азначэнне, зыходзячы з апазіцыі “мастацкая” – “дакументальная” літаратура і ўлічваючы пры гэтым ролю вымыслу ў тэксце. Так, А. Даўгапят адзначае, што «літаратура прыдуманая – гэта даследаванне “нявыкарыстаных” жыццём магчымасцей рэальнасці» [2]. С. Файбісовіч сведчыць, што праз імклівую экспансію non-fiction «<…> уласна жыццё ў яго як фармальных, так і зместавых параметрах усё большай колькасцю аўтараў адчуваецца не як матэрыял для творчасці, а як гатовы твор» [3]. У той жа час некаторыя даследчыкі робяць акцэнт на дакументальным пачатку ў творах нон-фікшн. Важнасць дакумента як прыёму падкрэсліваюць Н. Максімкіна («Документализм как ведущий принцип изображения действительности в творчестве С. Фетисова») і А. Драгамошчанка («Нашто літаратуры ўяўленне»), пазіцыянуючы яго як сродак зніжэння творчага вымыслу і набліжэння твора да рэальнага жыцця.

Разам з тым варта адзначыць, што наяўнасць аб’ектыўнай праўдзівасці ўласціва дакументам у “чыстым” разуменні, да якіх адносяцца дзелавыя паперы (справаздачы, даведкі, статуты), а таксама сціслыя біяграфіі, фотаздымкі, рэпартажы, што не маюць дачынення да мастацкай літаратуры ці часам уключаюцца ў яе тэксты ў выглядзе фрагментаў. Дакументы, сінтэзаваныя, відазмененыя пісьменнікамі ў мастацка-эстэтычным аспекце, займаюць у літаратуры нон-фікшн адметнае месца.

У аўтабіяграфічных тэкстах у якасці дакументальнай асновы выступаюць праявы навакольнага свету, прапушчаныя праз прызму пісьменніцкага ўспрымання. У выніку выяўлення аўтарскага суб’ектывізму інфармацыйная функцыя такога твора адыходзіць на другі план, саступаючы месца філасофска-эстэтычнай. Аўтахарактарыстыка творцы, яго самаацэнка, светабачанне выяўляюцца тут, як правіла, у маналогах, лірычных адступленнях, снах і думках. Пры гэтым на эстэтычныя рэфлексіі аўтара можа накладацца жыццёвы вопыт чытача – веды пра апісаныя з’явы і падзеі, а таксама пра асобу пісьменніка. Аднак, як слушна сцвярджае А. Местэргазі, веды пра біяграфічнага аўтара ў літаратуры факта не з’яўляюцца абавязковымі, у той час як «без “вобраза аўтара” перастане існаваць твор, паколькі “вобраз аўтара” можна параўнаць з воссю, вакол якой круціцца і без якой непазбежна распадаецца створаны пісьменнікам мастацкі свет» [4, с. 117]. У сувязі з гэтым варта ўзгадаць неадназначную ролю творцы ў тэкстах нон-фікшн, які можа, паводле Л. Нюбінай, выступаць «<…> у трох функцыях адначасова – аўтара як гістарычнай асобы, суб’екта, які распавядае пра ўласнае жыццё, і героя ці аб’екта расповеду» [5, с. 110]. Множнасць іпастасей творчага “я” як адна з прыкмет “мастацкасці” арганічна дапаўняецца рэтраспектыўнасцю ў змесце – поўнай (да прыкладу, у споведзях) ці частковай (у мемуарах). Адлегласць паміж часам, у якім адбыліся важныя для аўтара падзеі, і часам, калі яны былі занатаваныя, нярэдка прыводзіць да пэўных недакладнасцей у адлюстраванні фактаў, што абумоўлена спецыфікай чалавечай памяці.

Калі ў аўтабіяграфічнай прозе вобраз аўтара ставіцца ў цэнтр адлюстраваных падзей, то ў дакументальна-мастацкіх творах ён адыходзіць на другі план ці саступае пазіцыю цэнтральнага героя іншым персанажам і з’явам. Аднак змена аб’екта нарацыі не надае твору значнага праўдападабенства. Большасць аўтэнтычных жыццёвых рэалій падпадае пад аўтарскую інтэрпрэтацыю, за кошт чаго зніжаецца інтэнцыя да шчырасці, адкрытасці, уласцівая дзённікам, мемуарам і споведзям. Акрамя гэтага, так званыя мнеманічныя лакуны ў дакументальна-мастацкай літаратуры не ўяўляюць асаблівай праблемы для ўспрымання тэксту чытачом, паколькі могуць быць паспяхова кампенсаваныя творчай фантазіяй аўтара. А. Цесля адзначае паступовае замяшчэнне ў сучаснай літаратуры цыклічных жанраў фрагментарнымі, паколькі «<…> неабавязковасць

апошніх пазбаўляе іх ад пастак памяці: апошнія больш не перашкода, а сама форма існавання памяці» [6]. Такім чынам, скажоныя рэальныя падзеі выступаюць у ролі аб'ектыўнай інфармацыі, якая і прапануецца чытачу. Адпаведна зніжаецца і значнасць хранатопу ў дакументальна-мастацкім тэксце, які перастае выконваць структураўтваральную функцыю, становячыся другасным элементам у адносінах да пісьменніцкага вымыслу. Відавочны сінтэз дакументалізму, у якім эмпірыка, «<…> вопыт трымае на прывязі вымысел і нібы вядзе барацьбу са структурным пачаткам» [7, с. 27], і мастацкай фантазіі, якая дазваляе ведам «<…> даваць матэрыял для вольнай работы задумы і вымыслу» [7, с. 27], стварае перашкоды для даследчыкаў пры вызначэнні ступені верагоднасці ўзгаданых пісьменнікамі фактаў у дакументальна-мастацкіх творах. Такі аспект дазваляе многім літаратуразнаўцам (А. Цеслі, Т. Дронавай, Ж. З'ёнтку) гаварыць пра дакумент ужо як пра сюжэтаўтваральную аснову твора, а не як пра сродак праўдзівасці і рэалістычнасці, пры гэтым не адмаўляючы існавання апазіцыі «дакумент – літаратура», але разам з тым прагназуючы хуткае знікненне дакументальнай прозы. Такі тэзіс сфармуляваў яшчэ Ж. Ф. Жакар, адзначыўшы, што «адзіная рэальная рэч у творы мастацтва – гэта сам твор мастацтва» [8]. Іншымі словамі, наяўнасць разнастайных дакументаў у структуры дакументальна-мастацкіх тэкстаў не пазбаўляе апошніх эстэтычнай вартасці, але дакладнае размежаванне дакументальнага і мастацкага пачаткаў пры аналізе пэўнага твора з'яўляецца немэтазгодным і можа паспрыяць неапраўдана аднабаковаму падыходу да праблемы.

Не менш спрэчным, чым вызначэнне ступені праўдзівасці дакумента ў структуры мастацкага твора, з'яўляецца пытанне ўзаемадачынення літаратуры нон-фікшн і эстэтычнага пачатку як галоўнага атрыбута мастацкіх твораў. Вядома, што ў апошніх эстэтычнае перажыванне выступае як рэфлексійнае пачуццё чытача, якое ўзнікае, па сутнасці, з дапамогай гульні, паколькі рэальнасць у такіх тэкстах нярэдка не адлюстроўваецца, а мадэлюецца аўтарам. Ю. Бораў, вызначаючы характэрныя рысы мастацкага твора, называе ў іх ліку наступныя: «<…> 4) прадмет, пра які ідзе размова ў тэксце, па-за тэкстам не існуе, 5) поле адносін, на аснове якога ўзнікае камунікацыя рэцыпіента з мастацкім тэкстам, не існуе да ўспрымання гэтага тэксту. Адносіны рэцыпіента да тэксту – тлумачэнне (інтэрпрэтацыя)» [9, с. 123]. Адпаведна на падставе таго, што «мастацкі тэкст – першая ступень бытавання мастацтва, <…> носьбіт канцэптуальна нагружанай і каштоўнасна арыентаванай інфармацыі» [9, с. 123], адмаўляецца эстэтычная вартасць "непрыдуманай" літаратуры. Такое меркаванне выказвае і А. Цесля, які сцвярджае другаснасць дакументальнай прозы ў адносінах да мастацкай. Аўтар першай свядома стварае тэкст, што прэтэндуе на немастацкасць, таму інтэнцыя на напісанне нон-фікшн – «<…> першапачатковы жэст разрыву, тэкст сцвярджае, што ён не літаратура» [6].

Відавочна, што і Ю. Бораў, і А. Цесля прытрымліваюцца вузкага разумення нявыдуманай прозы, атаясамліваючы яе з сухой канстатацыяй фактаў і дакументаў. Насуперак такому меркаванню А. Местэргазі вызначае нон-фікшн як дакументальны ўплыў у мастацкай літаратуры, паколькі «твор non-fiction, пабудаваны выключна на ўглядванні ў "агаленыя" факты, часта апынаецца пазбаўленым вялікай мастацкай і жыццёвай праўды» [1, с. 28]. Даследчыца падкрэслівае недастатковасць прэзентавання чытачу дакумента, не арганізаванага ўнікальным аўтарскім бачаннем. У такім выпадку апрацоўка фактаў пісьменнікам з'яўляецца прыкметай не мадыфікацыі рэчаіснасці, а апрацоўкі твора нон-фікшн у эстэтычным плане. Л. Гінзбург небеспадстаўна сцвярджае, што любы занатаваны факт a priori з'яўляецца эстэтычна апрацаваным, бо «ніякая падзея знешняга свету не можа быць вядомай <…> ва ўсёй паўнаце думак, перажыванняў, імкненняў яе ўдзельнікаў – ён (аўтар. – *Г. Н.*) можа пра іх толькі здагадвацца» [7, с. 8]. Дзякуючы гэтай недасведчанасці аўтара лакуны ў канве тэксту паспяхова запаўняюцца за кошт уяўлення.

Яшчэ адна група крытыкаў спыняе сваю ўвагу на аўтабіяграфічных творах нон-фікшн. Такая літаратура выступае, на іх думку, другаснай, паколькі разумеецца толькі як сродак дадатковага самараскрыцця пісьменніка, не здольнага напоўніцу самарэалізавацца ва ўласных мастацкіх творах. На падставе гэтага Л. Луцэвіч прапануе тэксты з дамінантай эга-дакумента аб'яднаць пад назвай "перадлітаратура" [10], а А. Геніс сцвярджае эстэтычную значнасць ужо не твора ці яго героя, але аўтара, унікальнасці «<…> творчай асобы, нераскладальнай сумы супярэчнасцей, сабранай у мастацкай свядомасці, непаўторнасці рэакцый на свет, эксцэнтрычнай выключнасці

духоўнага вопыту» [11]. Падобная змена арыенціраў можа быць растлумачана крызісам мастацтва слова, яго неканкурэнтаздольнасцю ў параўнанні з тэлебачаннем і кіно. Менавіта таму літаратура на сучасным этапе сімулюе навізну, замяняючы сюжэт дзеяннем і праз гэта – фантазію фактам.

Вострапалемічнай да гэтага часу застаецца праблема жанравай дыферэнцыяцыі ў межах нон-фікшн. Пад літаратурай факта Н. Чужак прапануе разумець «нарыс і навукова-мастацкую манаграфію; газету і фактамантаж; газетны і часопісны фельетон <…>; біяграфію <…>; мемуары; аўтабіяграфію і чалавечы дакумент; эсэ; дзённік; справаздачу з пасяджэння суда <…>; апісанне вандровак і гістарычныя экскурсы; запісы сходу і мітынгу <…>; карэспандэнцыю з месца; памфлет, пародыю, сатыру; і г. д., і г. д.» [12]. А. Геніс значна пашырае кола жанраў, уключаючы ў яго «<…> не толькі навукова-папулярныя сачыненні, філасофскія трактаты, дарожныя нататкі, палітычныя праграмы і кулінарныя рэцэпты, але і лірычныя вершы, а таксама прыгожае, але небелетрыстычнае пісьменства, да якога належаць эсэ, дзённікі, лісты, гуманітарная проза, у тым ліку ўсемагчымыя “раманы-эсэ”, “раманы без хлусні”» [11]. А. Цесля, наадварот, імкнучыся да канкрэтыкі, робіць акцэнт на дамінанце аўтабіяграфічнага факта ў нон-фікшн і таму да дакументальнай прозы адносіць «<…> 1) дзённік, 2) ліст і ў некаторай ступені, 3) мемуары, успаміны і аўтабіяграфіі» [6]. Разам з тым на падставе шырокамаштабнасці з’явы нон-фікшн было б мэтазгодна разглядаць і структураваць яе не толькі ў аспекце наяўнасці / адсутнасці ў тэксце дакумента, але і паводле ступені яго эстэтычнай апрацоўкі.

Сучасная культурная сітуацыя дазваляе разглядаць феномен нон-фікшн на двух узроўнях. У якасці першага выступае ўласна «непрыдуманая» літаратура: слоўнікі, даведнікі, навукова-папулярныя публікацыі, артыкулы, альманахі, дыяграмы, планы, праекты, фотаздымкі, журналістыка, статуты, тэзаўрусы, травелогі, кулінарныя кнігі і інш. Другі ўзровень нон-фікшн набывае, узаемадзейнічаючы з мастацкай літаратурай у той ці іншай ступені. Мяжа між узроўнямі, паводле А. Геніса, праводзіцца дзякуючы функцыі персанажа: «<…> менавіта яго адсутнасць пазбаўляе літаратуру вымыслу, які і робіць яе “мастацкай”» [11].

В. Гумбальт разглядаў любы твор мастацтва як жывую, самастойную адзінку, што «мае ўнутраную сілу і жыццёвы прынцып, дзякуючы якому ўздзейнічае пэўным чынам» [13, с. 224]. Акрэсленая даследчыкам аўтаномнасць не можа не ўплываць на сэнсаўтваральны працэс. Гэта значыць, патэнцыяльная шматузроўневасць мастацкага тэксту рэалізуецца праз дыялог аўтара і чытача, прычым розная ступень жыццёвай дасведчанасці апошняга, а таксама колькасць прачытанняў ім тэксту спрыяюць пастаяннаму наслаенню сэнсаў адзін на аднаго. У сваю чаргу, літаратура нон-фікшн рэалізуе эстэтычную глыбіню дзякуючы наступным адметнасцям:

– *“патраенне” аўтарскай прысутнасці ў тэксце.* Праз вобраз аўтара пісьменнік рэалізуе сябе як стваральнік канкрэтнага тэксту і адначасова герой аповеду (у дакументальна-мастацкай прозе); а ў прозе аўтабіяграфічнай (дзённіках, мемуарах, споведзях) – яшчэ і як адрасат. У параўнанні з такой структурай вобраз чытача мае спрошчаны выгляд. Чытач, з аднаго боку, уяўляе сабой адрасата тэксту і выступае ў якасці імпульсу для ўзнікнення і рэалізацыі задумы пісьменніка, з другога – з’яўляецца ўдзельнікам сэнсаўтваральнага працэсу, прапускаючы мастацкую рэальнасць праз уласную свядомасць;

– *гіпатэтычная няскончанасць.* Дзейсным стымулам для чытацкага ўяўлення з’яўляюцца не толькі шматлікія алюзіі і рэмінісцэнцыі аўтара, але і фігуры замоўчвання, наўмысныя ці выпадковыя лакуны ў структуры твора ці яго відавочная няскончанасць. Такія асаблівасці ўласцівы перадусім аўтабіяграфічнай літаратуры, паколькі яе фрагментарнасць, схільнасць да раптоўнага перарывання (як у форме дзённіка), мнеманічныя “пусткі” і недакладнасці (мемуары, споведзі) абумоўлены самой жанравай прыродай;

– *суаднесенасць твора з постмадэрнісцкай традыцыяй.* Такім тэкстам, што ўвасабляюць, па словах Л. Перон-Муазес, «бясконцае поле для гульні пісьма» [14, с. 103], уласціва празмерная насычанасць інфармацыяй, што спрыяе ажыццяўленню бясконцай гульні аўтара з чытачом, звязанай з пошукам неадназначных інтэрпрэтацый. Прынцып гульні падтрымліваецца каламбурам, пастышызацыяй, узмацненнем карнавальнага пачатку, іроніяй і сарказмам і іншымі сродкамі выяўленчай выразнасці;

*– адначасовае выкарыстанне аўтарам некалькіх відаў факалізацыі пры напісанні аднаго тэксту.* Ж. Жэнет вылучае такія віды арганізацыі выражанага ў аповедзе пункта гледжання, як нулявая, дзе наратар – усеахопная катэгорыя, унутраная (апавядальнік паведамляе выключна тое, што гіпатэтычна ведае персанаж) і знешняя (персанаж ведае больш, чым паведамляе пра гэта наратар). Фокус нарацыі ў любым літаратурным тэксце з'яўляецца непастаяннай велічынёй, паколькі на яго могуць уплываць змены тэмы твора аўтарам, сэнсу якой-небудзь падзеі, ролі і значэння пратаганіста і г. д. Нестатычнасць факалізацыі ўласціва перадусім дакументальна-мастацкім творам, у якіх фантазія пісьменніка не звязана з неабходнасцю прытрымлівацца фактаграфіі. Дзённікі, мемуары і споведзі падкрэсліваюць аўтарэпрэзентатыўны характар творчасці. Акрамя гэтага, як слушна сцвярджае Л. Гінзбург, «аўтар твораў мемуарнага і аўтабіяграфічнага жанру заўсёды з'яўляецца свайго роду станоўчым героем» [8, с. 180], што абумоўлівае значны давер чытача да яго пункта гледжання ў творы і адсюль – немагчымасць кардынальнай змены фокуса нарацыі;

*– падкрэсленая транстэкстуальнасць у параўнанні з творамі мастацкай літаратуры, якія не належаць да постмадэрнісцкага дыскурсу.*

Асновай літаратурнасці, паводле Ж. Жэнета, з'яўляецца «сукупнасць некаторых абагульненых, трансцэндэнтальных класаў (тыпаў дыскурсу, спосабаў выказвання, літаратурных жанраў), да якіх можа быць аднесены кожны канкрэтны тэкст» [15, с. 58]. Гэтая з'ява, якая атрымала назву транстэкстуальнасці, уключае ў сябе пяць тыпаў суадносін, што рэалізуюцца і ў творах нон-фікшн. Архітэкстуальнасць як жанравая сувязь тэкстаў уласціва перадусім творам псеўданон-фікшн, паколькі ўзнікае пры тоеснасці формы ці зместу між рознымі тэкстамі ці дыскурсамі. Метатэкстуальнасць – адносіны каментавання аднаго тэксту іншым, выражаныя ў разнастайных заўвагах, пасляслоўях, аўтарскіх рэмарках і інш., – з'яўляецца характэрнай прыкметай твораў нон-фікшн, прысвечаных апісанню мастацкай літаратуры, якія, па сутнасці, выконваюць функцыю разгорнутых каментарыяў. Адносіны супрысутнасці паміж двума або некалькімі тэкстамі, ці інтэртэкстуальнасць, звычайна выражаюцца праз традыцыйную практыку цытавання, плагіят, алюзіі і больш уласцівы тэкстам нон-фікшн на аснове мастацкай літаратуры і псеўданон-фішн, у якіх адлюстраваны моцныя сувязі з мастацкімі тэкстамі, у тым ліку псеўдагістарычнымі крыніцамі. Паратэкстуальнасць (адносіны тэксту са сваім калятэкставым акружэннем – загалоўкам, эпіграфам, прысвячэннем, прадмовай, ілюстрацыямі і інш.) і гіпертэкстуальнасць (“прышчэпкавыя” адносіны між тэкстамі, калі, зліваючыся, яны не губляюць сваёй змястоўнасці і адметнасці) уласцівы большасці твораў нон-фікшн незалежна ад іх зместавай напоўненасці, але прэваліруюць менавіта ў аўтабіяграфічнай прозе. Чужыя тэксты, згадкі пра пэўныя гістарычныя, сацыяльныя, культурныя, палітычныя падзеі, ацэнка дзейнасці творцаў-сучаснікаў, пэўных лёсавызначальных з'яў спрыяюць стварэнню вобразнасці ў дзённіках, мемуарах і споведзях аўтара-апавядальніка, а таксама яго эпохі. Тэкст пры гэтым, як сцвярджае Р. Барт, «утвараецца з ананімных, няўлоўных і разам з тым ужо чытаных цытат – з цытат без двукосся» [16, с. 418];

*– балансіроўка на мяжы рэальнасці і вымыслу.* Адной з галоўных адметнасцей дакументальнай прозы з'яўляецца высвятленне суаднесенасці паняццяў “факт” і “дакумент”, а таксама ступень прымеркаванасці абодвух да рэальнасці. Як сцвярджае І. Шайтанаў, «факт – гэта не толькі дата, падзея, але і ўражанне» [17, с. 7]. Падобным чынам можна ахарактарызаваць і дакумент, паколькі ён з'яўляецца вынікам чалавечай дзейнасці, на пэўным этапе свайго стварэння быў прапушчаны праз прызму чыёйсьці свядомасці і малаверагодна, што адлюстроўвае пэўную з'яву/падзею з усіх бакоў, аб'ектыўна і дакладна. На падставе гэтага Т. Дронава падсумоўвае: «Аднымі з цікавых тэндэнцый у мастацка-гістарычнай свядомасці ХХ стагоддзя з'яўляюцца адмова ад «прэзумпцыі праўдзівасці» дакумента і разуменне абмежаванасці «праўды» крыніцы праз яе суб'ектыўны характар і тэкставую (наратыўную) структуру» [18, с. 77]. Яшчэ ў 1920-я гг. пазіцыя Ю. Тынянава адносна праўдзівасці дакументальных крыніц вызначалася глыбокім недаверам: «Там, дзе канчаецца дакумент, там я пачынаю» [19, с. 199]. Разам з тым відавочна, што дадумванне фактаў непазбежнае, паколькі не ўсе з'явы навакольнай рэчаіснасці могуць быць задакументаваны. Аднак гэтае дамысліванне не павінна моцна скажаць факт, інакш мэтазгоднасць ужывання апошняга будзе неапраўданай.

Такім чынам, феномен нон-фікшн (ці дакументальная літаратура, дакументалістыка) – гэта з'ява, якая існуе ў дзвюх іпастасях адначасова: як самастойная "літаратура факта" і ў выглядзе дакументальнага пачатку мастацкага твора. У апошнім выпадку маюцца на ўвазе як аўтабіяграфічныя (дзённікі, мемуары, споведзі), так і дакументальна-мастацкія (мастацкія хронікі, эсэ, белетрызаваныя біяграфіі) тэксты. У якасці адметнасцей, агульных для большасці тэкстаў нон-фікшн, выступаюць "патраенне" аўтарскай прысутнасці ў тэксце, гіпатэтычная няскончанасць, суаднесенасць твора з постмадэрнісцкай традыцыяй, змешванне розных відаў факалізацыі ў межах аднаго тэксту, падкрэсленая транстэкстуальнасць, балансіроўка на мяжы рэальнасці і вымыслу.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Местергази, Е. Г. Художественная словесность и реальность (документальное начало в отечественной литературе XX века) : автореф. дис. … д-ра филол. наук: 10.01.08 / Е. Г. Местергази. – М., 2008. – 51 с.

2. Долгопят, Е. Для чего литературе воображение. Конференц-зал / Е. Долгопят [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://magazines.russ.ru /znamia/2006/1/voo12.html. – Дата доступа: 21.12.2014.

3. Файбисович, С. Для чего литературе воображение. Конференц-зал / С. Файбисович [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://magazines.russ.ru/znamia/2006/1/voo12.html. – Дата доступа: 27.12.2014.

4. Местергази, Е. Г. Литература нон-фикшн/non-fiction / Е. Г. Местергази. – М.: Совпадение: Университетская книга, 2007. – 325 с.

5. Нюбина, Л. М. Человек вспоминающий / Л. М. Нюбина // Человек. – 2010. – №2. – С. 107–114.

6. Тесля, А. Документальная проза: проблема и история жанров / А. Тесля [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://rummuseum.ru /portal/node/2620. – Дата доступа: 25.01.2015.

7. Гинзбург, Л. Д. О психологической прозе / Л. Д. Гинзбург. – М. : Intrada, 1999. – 413 с.

8. Жаккар, Ж.-Ф. Литература как таковая. От Набокова к Пушкину : Избранные работы о русской словесности / Ж.-Ф. Жаккар [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://coollib.net/b/221862/read#t4. – Дата доступа: 23.02.2015.

9. Борев, Ю. Б. Эстетика / Ю. Б. Борев. – М. : Высш. шк., 2002. – 511 с.

10. Луцевич, Л. Документальность и эго-документ / Л. Луцевич [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.imli.ru/structure/theory/krugl_stol.php. – Дата доступа: 17.03.2015.

11. Генис, А. Фотография души. В окрестностях филологического романа / А. Генис [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://magazines.russ.ru /zvezda/2000/9/genis.html. – Дата доступа: 08.04.2015.

12. Чужак, Н. Литература жизнестроения (Исторический пробег) / Н. Чужак // Литература факта: Первый сборник материалов работников ЛЕФа [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ruslit.traumlibrary.net/ book/sbornik-literatura-fakta/sbornik-literatura-fakta.html. – Дата доступа: 07.02.2015.

13. Гумбольдт, В. Язык и философия культуры / В. Гумбольдт. – М. : Прогресс, 1985. – 452 с.

14. Ильин, И. П. Постструктурализм. Деконструктивизм. Постмодернизм / И. П. Ильин. – М. : Интрада, 1996. – 255 с.

15. Женетт, Ж. Палимпсесты: литература во второй степени / Ж. Женетт. – М.: Наука, 1989. – 130 с.

16. Барт, Р. Избранные работы: Семиотика. Поэтика / Р. Барт. – М.: Прогресс, Универс, 1994. – 616 с.

17. Шайтанов, И. Попытка прогноза / И. Шайтанов // Вопр. литературы. – 2000. – № 1. – С. 7–14.

18. Дронова, Т. «Проблематизация» достоверности документа в художественно-историческом сознании XX века / Т. Дронова // Изв. СГУ. Социология. Политология. – 2009. – Т.9, вып.1. – С. 76–81.

19. Гурштейн, А. А. Роман Тынянова о Пушкине [Статья опубликована в журнале «Октябрь» № 8, 1937] / А. А. Гурштейн // Гурштейн А. А. Избранные статьи. – М.: Сов. писатель, 1959. – С. 198–201.

## References

1. Mestergazi, E. G. (2008), "Art Literature and Reality (The Documentary Base in the 20th-century Native Literature) ", Abstract of D. Sc. Dissertation, The theory of literature, Textual, Literary Institute. AM Gorky, Moscow, RU.

2. Dolgopyat, E. "What Does Literature Need Imagination For? Conference Hall", Available at: http://magazines.russ.ru/znamia/2006/1/voo12.html/, (Accessed 21 April 2015).

3. Faibisovich, S. "What Does Literature Need Imagination For? Conference Hall", Available at: http://magazines.russ.ru/znamia/2006/1/voo12.html/, (Accessed 21 April 2015).

4. Mestergazi, E. G. (2007), *Literatura non-fikshn / non-fiction* [Non-fiction], Coincidence: University book, Moscow, RU.

5. Nyubina, L. M. (2010), "Homo Reminiscens", *Chelovek* [Man], no.2, pp. 107–114.

6. Teslya, A. "Documentary Prose: The Problem and History of Genres", Available at: http://rummuseum.ru/portal/node/2620/, (Accessed 25 January 2015).

7. Ginzburg, L. D. (1999), *O psikhologicheskoi proze* [About Psychological Prose], Intrada, Moscow, RU.

8. Zhakkar, Zh.-F. "Literature as Such. From Nabokov to Pushkin: Selected Works of Russian Literature", Available at: http://coollib.net/b/221862/read#t4/, (Accessed 22 February 2015).

9. Borev, Yu. (2002), *Estetika* [Aesthetics], High school, Moscow, RU.

10. Lutsevich, L. ″Documentary and Ego-document″, Available at: http://www.imli.ru/structure/theory/krugl_stol.php/, (Accessed 17 March 2015).

11. Genis, A. (2000), ″Photo of the Soul. It the Vicinity of Philological Novel″, Available at: http://magazines.russ.ru/zvezda/2000/9/genis.html/, (Accessed 12 March 2015).

12. Chuzhak, N. ″Literature of Life Building (A Historical Run)″, Available at: http://ruslit.traumlibrary.net/book/sbornik-literatura-fakta/sbornik-literatura-fakta.html/, (Accessed 03 April 2015).

13. Gumbol'dt, V. (1985), *Yazyk i filosofiya kul'tury* [Language and Philosophy of Culture], Progress, Moscow, RU.

14. Il'in, I. P. (1996), *Poststrukturalizm. Dekonstruktivizm. Postmodernizm* [Poststructuralism. Deconstructivism. Postmodernism], Intrada, Moscow, RU.

15. Zhenett, Zh. (1989), *Palimpsesty: literatura vo vtoroi stepeni* [Palimpsests: Literature to the Power of Two], The Science, Moscow, RU.

16. Bart, R. (1994), *Izbrannye raboty: Semiotika. Poetika* [Selected Works: Semiotics. Poetics], Progress, Moscow, RU.

17. Shaitanov, I. (2000), ″Trying to Forecast″, *Voprosy literatury* [Literary Issues], no. 1, pp. 7–14.

18. Dronova, T. (2009), ″The ‘Problematization’ of Document Authenticity in the 20th-century Artistic and Historical Perception″, *Izvestiya SGU. Sociologiya. Politologiya* [Proceedings of the SGU. Sociology. Political Science], no. 9, pp. 76–81.

19. Gurshtein, A. A. (1959), ″Tynianov's Novel about Pushkin″, in Gurshtein, A. A. Izbrannye stat'i [Featured article], Soviet writer, Moscow, RU, pp. 198–201.

## Информация об авторе

*Новик Анна Юрьевна* – аспирант. ГНУ “Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси” (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail : thenameofpear@gmail.com.

## Information about the author

*Novik Anna Yuryevna,* postgraduate student, Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: thenameofpear@gmail.com.

## Для цитирования

Новік, Г. Ю. Феномен літаратуры нон-фікшн: аспекты тэорыі і верыфікацыі / Г. Ю. Новік // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 1. – С. 99–105.

## For citation

Novik A. Y. Non-fiction Phenomenon: Theoretical and Verificational Aspects. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2017, no. 1, pp. 99–105.